## Тэст 1

На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца 120 хвілін. **У заданнях часткі А некалькі правільных адказаў. Адказы да заданняў В1–В8, В13–В22 пішыце з малой літары.**

| | | |
|---|---|---|
| **A1** | Адзначце словы, у якіх правільна раскрыта лексічнае значэнне. | 1) немаўля – чалавек, які выклікае жаль, спачуванне;<br>2) поплаў – луг, які вясною заліваецца вадою;<br>3) золкі – пранізліва халодны, сыры;<br>4) небарака – вялікая чорная птушка, якая жывіцца падаллю;<br>5) песціць – маркоціцца, смуткаваць. |

**Адказ: 2, 3**

1- *немаўля* – малое дзіця, якое "не можа размаўляць" (младенец);
2- *поплаў* – лексічнае значаэнне вызначана правільна;
3- *золкі* – лексічнае значэнне вызначана правільна;
4- *небарака* – так называюць чалавека, які выклікае жаль і спачуванне;
5- *песціць* – адносіцца ласкава, з пяшчотаю.

| | | |
|---|---|---|
| **A2** | Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары: | 1) кветка **(р/Р)амонак**;<br>2) рыба **(л/Л)інь**;<br>3) **(т/Т)аццяніны** кнігі;<br>4) раман "**(п/П)алеская хроніка**";<br>5) знакаміты **(д/Д)октар.** |

**Адказ: 3, 4**

1- *кветка рамонак* – адносіны род/від не разглядаюцца як уласныя найменні і пішуцца з маленькай літары;
2- *рыба лінь* – адносіны род/від не разглядаюцца як уласныя найменні і пішуцца з маленькай літары;
3- *Таццяніны кнігі* – прыналежны прыметнік, што ўтвораны ад уласнага імя, таксама пішацца з вялікай літары;
4- *раман "Палеская хроніка"* – прыдатак, які абазначае назву, бярэцца ў двукоссі і пішацца з вялікай літары;
5- *знакаміты доктар* – агульны назоўнік, які абазначае прафесію, пішам з маленькай літары.

| | | |
|---|---|---|
| **A3** | Адзначце словы (прыклады) з правільным напісаннем падкрэсленых літар: | 1) тры**ў**мф;<br>2) ка**ў**гасны;<br>3) святочна-**у**рачысты;<br>4) лёг **у**поперак;<br>5) рака **У**сяж. |

**Адказ: 4, 5**

1- *тры**у**мф* – пад націскам пішам "*у*" ("*ў*" – зычная, на яе не можа падаць націск);
2- *ка**л**гасны* – складанаскарочанае слова = калектыўная гаспадарка (не можа скарацiцца да "*каў-*" );

3- *святочна-ўрачысты* – злучок не з’яўляецца знакам прыпынку, папярэдняе слова заканчваецца на галосную;
4- *лёг **у**поперак* – напісана правільна, пасля зычных пішам “*у*”;
5- *рака **У**сяж* – напісана правільна, вялікая літара толькі “*У*”.

| | | |
|---|---|---|
| **А4** | Адзначце правільна напісаныя словы: | 1) лепельскі;<br>2) слязмі;<br>3) дзьвесце;<br>4) бар’ер;<br>5) менш. |

**Адказ: 1, 4, 5**

1- *лепел**ь**скі* – напісана правільна, утваральнае слова сканчвалася на [л’], перад суфіксам *-ск-* мяккі знак захоўваецца для абазначэння [л’];
2- *слязь**мі*** – у <u>творным</u> склоне перад *-мі* пішацца ь;
3- ***дзв**есце* – асіміляцыйная мяккасць: [в’] уплывае на гук [дз’] (суседняя мяккасць);
4- *бар’ер* – напісана правільна, пасля “*р*” перад ётавымі пішацца апостраф;
5- *ме**нш*** – напісана правільна, спалучэнне не патрабуе мяккасці: [нш], дзе [ш] – зацвярдзелы, а [н] – цвёрды.

| | | |
|---|---|---|
| **А5** | Адзначце словы, якія трэба пісаць разам: | 1) (аўта) паркоўка;<br>2) (обер) пракурор;<br>3) (Бялыніцкі) Біруля;<br>4) (паў) лімона;<br>5) (трактара) будаванне. |

**Адказ: 1, 4, 5**

1- *аўтапаркоўка* – словы з першай часткай “*аўта-*” пішуцца разам;
2- *обер-пракурор* – словы з запазычанай часткай “*обер-*” пішуцца праз злучок;
3- *Бялыніцкі-Біруля* – складаныя прозвішчы пішуцца праз злучок;
4- *паўлімона* – частка “*паў-*” з агульнымі назоўнікамі пішацца разам;
5- *трактарабудаванне* – складанае слова, што ўтворана пры дапамозе злучальнай галоснай, пішацца разам.

| | | |
|---|---|---|
| **А6** | Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок: | 1) (прыгожа) аформлены;<br>2) (доўга) тэрміновы;<br>3) (фізіка) матэматычны;<br>4) (светла) сіні;<br>5) (чорна) валосы. |

**Адказ: 3, 4**

1- *прыгожа аформлены* – пішам асобна спалучэнні з першай часткай прыслоўем, што захавала сваё лексічнае значэнне (не тэрмін!);
2- *доўгатэрміновы* – пішам разам складанае слова, што ўтворана складаннем з суфіксацыяй (*доўгі* + *тэрмін* + *ов*);
3- *фізіка-матэматычны* – спалучэнне раўнапраўных слоў, можам падставіць злучнік “*і*”;
4- *светла-сіні* – адценні колеру і смаку пішуцца праз злучок;

5- *чорнавалосы* – пішам разам складанае слова, што ўтворана складаннем з нулявой суфіксацыяй (*чорныя* + *валасы* + *нульсуфікс* (для пераходу ў прыметнік).

| | | |
|---|---|---|
| **А7** | Адзначце прыклады, у якіх ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна: | 1) ***(не) абдымны*** прастор;<br>2) ***(не) варта*** сумнявацца;<br>3) ***(не) малыя***, але кіслыя яблыкі;<br>4) ураджай ***(не) сабраны***;<br>5) ***(не) дачакаўшыся*** дажджу. |

**Адказ: 2, 4, 5**

1- ***неабдымны*** прастор – без “*не*” не ўжываецца;
2- ***не варта*** сумнявацца – спалучэнні “*не трэба, не варта, не шкода*” пішам асобна;
3- ***немалыя,*** але кіслыя яблыкі – пішам разам прыметнік пры адсутнасці залежнага слова ці супрацьпастаўлення (кіслы і малы немагчыма параўнаць);
4- ураджай ***не сабраны*** – з кароткімі дзеепрыметнікі “*не*” пішам асобна;
5- ***не дачакаўшыся*** дажджу – “*не*” з дзеепрыслоўямі трэба пісаць асобна.

| | | |
|---|---|---|
| **А8** | Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы: | 1) тры пятых зямлі;<br>2) смяяліся над Толем;<br>3) не лепшы за іншых;<br>4) хварэць адзёрам;<br>5) пабеглі ў рыбу. |

**Адказ: 3, 5**

1- *тры пятыя зямлі* – лічэбнікі 2, 3, 4 у дзейніку дроба патрабуюць у назоўніку дроба форму Н.скл. мн. ліку;
2- *смяяліся з Толі* – дзеяслоў “*смяяцца*” патрабуе форму Р. скл. з прыназоўнікам “*з*”;
3- *не лепшы за іншых* – напісана правільна, ступень параўнання прыметнікаў і прыслоўяў патрабуе прыназоўніка “за”;
4- *хварэць на адзёр* – дзеяслоў “*хварэць, захварэць*” патрауе формы В. скл. разам з прыназоўнікам “*на*”;
5- *пабеглі ў рыбу* – напісана правільна, калі гаворка ідзе пра *грыбы, ягады, рыбу, дровы, шчаўе,* то ў такім спалучэнні будзе ўжывацца прыназоўнік “*у*” (мэта).

| | | |
|---|---|---|
| **А9** | Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ***абавязкова*** ставіцца працяжнік: | 1) Мова народа _ адзін з найвялікшых скарбаў.<br>2) Віця мне больш _ не сябар.<br>3) Ляснік ў гэтым раёне _ пашукаць такога!<br>4) Даўжыня абарончага вала _ трыста пяцьдзясят метраў.<br>5) Надвор’е, безумоўна, _ уплывае на псіхічны і фізічны стан чалавека. |

**Адказ: 1, 3, 4**

<table>
<tr><td colspan="3">1- працяжнік ставіцца, калі дзейнік выражаны назоўнікам у Н. скл., выказнік выражаны спалучэннем з назоўнікам пры прамым парадку слоў;<br>2- працяжнік не ставіцца перад выказнікам назоўнікам, калі пры ім стаіць адмоўная часціца “не”;<br>3- працяжнік ставіцца перад выказнікам, які выражаны устойлівым спалучэннем (фразеалагізмам);<br>4- працяжнік ставіцца, калі дзейнік выражаны назоўнікам у Н. скл., выказнік выражаны лічэбнікам ці спалучэннем лічэбніка з назоўнікам;<br>5- працяжнік не ставіцца, калі паміж дзейнікам і выказнікам стаіць пабочнае слова, недапасаваны член сказа ці часціца (безумоўна – пабочнае слова).</td></tr>
<tr><td>A10</td><td>Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:</td><td>1) Дзяцінства, ды юнацтва найбольш грунтоўна фарміруюць асобу чалавека.<br>2) Жоўтае, восеньскае лісце лётала па скверы, нагадваючы пра хуткую змену часу.<br>3) Я люблю легенд дасціпны сказ і народ свой, кемлівы і здольны.<br>4) Дзеці вераць шчыра чалавеку і зверу, і дрэву.<br>5) То выблісне маланка на міг адзіны, то зыркне, хоць пагляд хавай.</td></tr>
<tr><td colspan="3">Адказ: 3, 5<br>1- парушана норма: аднародныя дзейнікі звязаны злучнікавай сувяззю, адзіночным злучнікам “ды” (у значэнні і), у такім выпадку коска паміж аднароднымі не ставіцца;<br>2- парушана норма: азначэнні, падкрэсленыя ў сказе, не з’яўляюцца аднароднымі і не раздзяляюцца коскай, бо апісваюць прадмет з розных бакоў;<br>3- няма парушэння нормы: у сказе прадстаўлены 2 розныя рады аднародных: аднародныя дапаўненні, якія звязаны адзіночным злучнікам і, а таксама рад аднародных азначэнняў, якія таксама звязаны адзіночным злучнікам і, у такім выпадку коска паміж аднароднымі перад злучнікам і не ставіцца;<br>4- парушана норма: аднародныя дапаўненні звязаны паўторным злучнікам і, у такім выпадку перад першым злучнікам і коска ставіцца;<br>5- няма паруэння нормы: аднародныя выказнікі звязаны паўторным злучнікам то-то, у такім выпадку перад другім аднародным ставіцца коска.</td></tr>
<tr><td>A11</td><td>Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):</td><td>1) Ляжаць _ нібы ў абрусе белым _ лясы, палеткі і лугі.<br>2) Маім пачуццям так _ як скроням _ я не дазволю пасівець.<br>3) Эпісталярны жанр мы ведаем _ як адзін са спосабаў знаёмства з рэаліямі часу і ўнутраным жыццём асобы.<br>4) У гэтым краі сосны _ што вартаўнікі.</td></tr>
</table>

<table>
<tr><td></td><td></td><td>5) У той момант хмара _ нібы чорны парасон _ агарнула ўсю прастору.</td></tr>
<tr><td colspan="3">Адказ: 1, 2, 5<br><br>1- адасабляем параўнальны зварот з двух бакоў (ёсць аб’ект і прадмет параўнання, зварот уваходзіць у сказ пры дапамозе параўнальнага злучніка);<br>2- адасабляем параўнальны зварот з двух бакоў (ёсць аб’ект і прадмет параўнання, зварот уваходзіць у сказ пры дапамозе параўнальнага злучніка) “пасівець пачуццям так, як сівеюць скроні”;<br>3- коска не ставіцца перад як у выпадку, калі маецца на ўвазе ‘ў якасці’: у дадзеным сказе не параўноўваецца, а канстатуецца факт (эпісталярны жанр і ёсць адным са спосабаў...);<br>4- коска не ставіцца перад параўнальным зваротам, які з’яўляецца выказнікам (канстатацыя факта);<br>5- адасабляем параўнальны зварот з двух бакоў (ёсць аб’ект і прадмет параўнання, зварот уваходзіць у сказ пры дапамозе параўнальнага злучніка) “хмара чорная агарнула так, як агортвае чорны парасон”.</td></tr>
<tr><td>А12</td><td>Адзначце сказы, у якіх няма парушэнняў пунктуацыйных нормаў:</td><td>1) Тугія каласы, |пругка выгінаючы спелыя сцябліны|, пагойдваюцца пад гарачым павевам ветру.<br>2) З рыльца, |адсунутага на прыпечак|, чайніка[x] струменьчыкам пыхкала пара.<br>3) На гарышчы, |акрамя збаноў|, знайшліся яшчэ старыя кросны і надламаныя вілкі.<br>4) На Сорак пакутніцаў, ці інакш на Саракі трэба выконваць усе абрады.<br>5) Настала ноч, |кінуўшы месячны свет на ваду|, і |запаліўшы зоры-ліхтарыкі|.</td></tr>
<tr><td colspan="3">Адказ: 1, 3<br><br>1- няма парушэння нормы: дзеепрыслоўны зварот заўсёды аддзяляецца або выдзяляецца з двух бакоў коскамі (калі стаіць у сярэдзіне сказа);<br>2- парушана норма: дзеепрыметнікавы зварот стаіць перад азначаемым словам назоўнікам і не мае дадатковага акалічнаснага значэння мэты, прычыны ці ўступкі, коскамі не выдзяляецца;<br>3- парушэння нормы няма: адасобленае дапаўнаенне стаіць у сярэдзіне сказа, з двух бакоў выдзяляецца коскамі;<br>4- парушана норма: развіты прыдатак, які абазначае іншую назву і ўводзіцца ў сказ пры дапамозе злучніка ці/або, выдзяляецца коскамі з двух бакоў, калі стаіць у сярэдзіне сказа;<br>5- парушана норма: два дзеепрыслоўныя звароты, якія адносяцца да аднаго дзеяслова-выказнік і звязваюцца адзіночным злучнікам і, коскай не раздзяляюцца.</td></tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| **A13** | Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі): | 1) Прохар _ мусіць _ пагадзіцца са сваімі таварышамі.<br>2) Амаль _ ніколі не было яшчэ такой хвіліны, каб адчуваўся спакой.<br>3) У верасні _ дарэчы, таму і займеў сваю паэтычную назву першы месяц восені _ зацвітаюць верасы.<br>4) У такіх умовах _ і праўда _ немагчыма было сабрацца і добра падрыхтавацць да ўступных іспытаў.<br>5) Ноччу _ здавалася _ ні адна жывая істота не ўтварала ні гуку. |

**Адказ: 4, 5**

1- на месцы пропускаў коскі не ставяцца, слова *мусіць* не з'яўляецца пабочным, а ёсць часткай састаўнога дзеяслоўнага выказніка *мусіць пагадзіцца*;
2- коска не ставіцца, *амаль* не паказвае на адносіны моўцы, з'яўляецца прыслоўем;
3- на месцы пропусказ ставяцца не коскі, а дужкі (ці працяжнікі), адасабляючы пабочны сказ (ёсць граматычная аснова);
4- коскі ставяцца, выдзяляецца з двух бакоў пабочнае разам са злучнікам як адна структура (злучнік адносіцца не да сказа, а да пабочнага слова);
5- коскі ставяцца, пабочнае слова, што стаіць у сярэдзіне сказа, выдзяляецца коскамі.

| | | |
|---|---|---|
| **A14** | Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску: | 1) Марознай зорнай ноччу на дарозе то прасунуцца ціха сані _ то прамчыцца машына.<br>2) Колькі розуму _ і колькі мудрасці!<br>3) Закранеш галінку _ і тысячы кропель-брыльянтаў паляціць ўніз, адбіваючы сонечныя прамяні.<br>4) У ціхім садзе стаялі пустыя арэлі _ і ляжалі забытыя кнігі ў аранжарэі.<br>5) Ганна прыкрыкнула на брата _ і сама ўзялася несці рэчы. |

**Адказ: 1, 4**

1- часткі складаназлучанага сказа звязваюцць паўторным злучнікам *то-то*, коска ставіцца абавязкова;
2- часткі складаназлучанага сказа звязаны адзіносным злучнікам *і,* з'яўляюцца клічнымі, коска не ставіцца;
3- паміж часткамі складаназлучанага сказа рэалізуецца значэнне "прычына-вынік", такім чынам, на месцы пропуску трэба ставіць працяжнік;
4- часткі складаназлучанага сказа звязаны адзіночным злучнікам *і*, значэнне адначасовасці/паслядоўнасці, паміж часткамі трэба ставіць коску, *у ціхім садзе* не з'яўляецца агульным даданым членам сказа, бо ў другой частцы ёсць свая акалічнасць месца *ў аранжарэі*;

<table>
<tr><td colspan="3">5- паміж часткамі складаназлучанага сказа, звязанымі адзіночным злучнікам і, коска не ставіцца, калі ў другой часцы дзейнік выражаны займеннікам сам/сама/само/самі.</td></tr>
<tr><td>А15</td><td>Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:</td><td>1) Як добра ўсведамляць, што ты з’яўляешся пэўнай вартасцю для людзей, якія цябе акружаюць.<br>2) Калі машына праехала, лось зноў павярнуў у той бок, куды ішоў раней.<br>3) Бабуля казала, што, калі на Вербніцу ўстаць рана і папрасіць у звычайнай вярбы здароўя, то цэлы год не будзеш хварэць.<br>4) Пяро, якім мы пішам, атрымала назву ад птушынага пяра, што ўжывалася ў свой час, у якасці прылады да пісьма.<br>5) Хоць ноч на зямлі ідзе, і месяц схаваўся за хмарамі, ад квецені светла да раніцы.</td></tr>
<tr><td colspan="3">Адказ: 1, 2<br>1- у сказе няма парушэнняў нормы, складаназалежны сказ складаецца з трох частак, кожная частка аддзяляецца ад папярэдняй;<br>2- у сказе няма парушэнняў нормы, складаназалежны сказ складаецца з трох частак, кожная частка аддзяляецца ад папярэдняй;<br>3- пры збегу злучнікаў (напрыклад, што-калі) коска паміж злучнікамі не ставіцца ў выпадку, калі наступная частка складаназалежнага сказа пачынаецца з то/дык;<br>4- у сказе парушана норма: не патрэбна коска перад у якасці, гэта не частка сказа, у якой ёсць граматычная аснова;<br>5- у сказе парушана норма: пры сузалежным аднародным падпарадкаванні коска перад злучнікам і, які звязвае дзве дадзеныя часткі, не ставіцца.</td></tr>
<tr><td>А16</td><td>Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткмі сказаў не пастаўлены): [ ]: [ ].</td><td>1) Адчынеш акно ў хату дыхне жаданая вясна.<br>2) Спрадвеку ў нас так самае лепшае аддаём дзецям.<br>3) Юрась зайшоў у хату і зразумеў смачнымі дранікамі пачастуе бабуля.<br>4) У жыце валошка сінее спіць возера ў сівых туманах.<br>5) Нежын быў абраны Францішкам Багушэвічам невыпадкова у гэтым горадзе працаваў старшым лекарам Аляксандр Галаўня – яго сваяк.</td></tr>
</table>

**Адказ: 2, 3, 5**

1- Адчынеш акно – у хату дыхне жаданая вясна.

паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа неабходна паставіць працяжнік, бо ў сказе выражаецца значэнне “прычына-вынік” ці ўмова (можам падставіць *калі-то*);

2- Спрадвеку ў нас так: самае лепшае аддаём дзецям.

паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа неабходна паставіць двукроп’е, другая частка раскрывае, удакладняе змест папярэдняй (паміж часткамі магчыма паставіць “*а іменна як*”);

3- Юрась зайшоў у хату і зразумеў: смачнымі дранікамі пачастуе бабуля.

паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа неабходна паставіць двукроп’е, першая частка сканчваецца дзеясловам *зразумеў*, перад другой часткай магчыма падставіць *што*, такім чынам, другая частка будзе тлумачыць змест папярэдняй;

4- У жыце валошка сінее, спіць возера ў сівых туманах.

паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа неабходна паставіць коску, можам падставіць злучнік *і*, значэнне адначасовасці/паслядоўнасці;

5- Нежын быў абраны Францішкам Багушэвічам невыпадкова: у гэтым горадзе працаваў старшым лекарам Аляксандр Галаўня – яго сваяк.

паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа неабходна паставіць двукроп’е, другая частка раскрывае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай (чаму невыпадкова?).

| | | |
|---|---|---|
| **А17** | Адзначце нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак трэба паставіць коску: | *Цэлы пласт беларускіх назваў паселішчаў сфарміраваўся менавіта на аснове земляробчай тэматыкі 1)__ і гэта лёгка растлумачыць 2) __ найважнейшым заняткам і клопатам нашчадкаў летапісных крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў 3) __ якія моцна звязалі свой лёс з суровымі рэаліямі краю 4) __ і іякія развівалі гаспадарку ў лясіста-балоцістай мясцовасці 5) __ было рольніцтва – культурнае асваенне лясной зямлі, распрацоўка лесу пад ворыва і сенажаць.* |

**Адказ: 1, 3, 5**

*Цэлы пласт беларускіх назваў паселішчаў сфарміраваўся менавіта на аснове земляробчай тэматыкі 1), і гэта лёгка растлумачыць 2) : найважнейшым заняткам і клопатам нашчадкаў летапісных крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў 3) , якія моцна звязалі свой лёс з суровымі рэаліямі краю 4) і іякія развівалі гаспадарку ў лясіста-балоцістай мясцовасці 5) , было рольніцтва – культурнае асваенне лясной зямлі, распрацоўка лесу пад ворыва і сенажаць.*

1- на месцы пропуску ставім коску, часткі сказа звязаны злучнікавай сувяззю, рэалізуецца значэнне адначасовасці/паслядоўнасці;
2- на месцы пропуску ставім двукроп'е, часткі звязаны бяззлучнікавай сувяззю, другая частка тлумачыць змест папярэдняй, паказваецца на прычыну;
3- на месцы пропуску неабходна ставіць працяжнік, часткі звязаны падпарадкавальнай сувяззю, развітая даданая частка аддзяляецца коскай;
4- на месцы пропуску не трэба ставіць знак прыпынку, пры сузалежным аднародным падпарадкаванні дзве часткі залежаць ад адной галоўнай і звязаны злучнікам *і*;
5- на месцы пропуску трэба паставіць коску, каб закрыць дадаиую частку.

| | | |
|---|---|---|
| **A18** | Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць сказу з простай мовай:<br>*"Гармоні сваёй так, кажаш, і не набыў?" – пытаўся дзядзька ў Рамана і нагадваў – "Памятаеш, як хваліўся, што першым жаніхом на ўсю воласць будзеш?"* | 1) у сказе адсутнічае коска;<br>2) у сказе адсутнічае двукроп'е;<br>3) у сказе адсутнічае кропка;<br>4) у сказе адсутнічае працяжнік;<br>5) простая мова няправільна заключана ў двукоссі. |

**Адказ: 2, 5**

Прыведзены сказ адпавядае наступнай схеме пабудовы простай мовы: "П? – а: - П?"

Простая мова няправільна заключана ў двукоссі, таму што гаворыць адна асоба, а значыць, неабходна браць у двукоссі цалкам выказванне, а не кожную яго частку.

У словах аўтара два дзеясловы маўлення (*пытаўся і нагадваў*), а таму пасля слоў аўтара перад другой часткай простай мовы ставіцца двукроп'е.

| | |
|---|---|
| **B1** | З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:<br>*канцэрт, маянэз, галантэрэя, цэнаўтварэнне, траскатня.* |

**Адказ: галантарэя**

*канцэрт* – запазычанае слова, [а] каранёвае і [э] у моцнай пазіцыі (пад націскам);

*маянэз* – запазычанае спалучэнне [йо] не пад націскам перадаецца праз я;

*галантарэя* – [о/э] не пад націскам пераходзяць у [а] у беларускіх і даўно запазычаных словах;

*цэнаўтварэнне* – у складаным слове, у першай частцы якога першапачаткова было [э], яно і захоўваецца;

*траскатня* – ад слова *трэск* - [о/э] не пад націскам пераходзяць у [а] у беларускіх і даўно запазычаных словах.

| | |
|---|---|
| **В2** | З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:<br>*далягляд, несеннесушылка, збраеносец, землеўладальнік, элексір.* |

**Адказ: збраяносец**

*далягляд* – складаны назоўнік утвораны пры дапамозе злучальнай галоснай *-е-*, якая падпарадкоўваецца агульнаму правілу якання: у першым пераднаціскным складзе *е/ё* пераходзяць у *я*;

*несеннесушылка* – складаны назоўнік утвораны пры дапамозе злучальнай галоснай *-е-,* якая падпарадкоўваецца агульнаму правілу якання: ва ўсіх іншых складах, акрамя першага пераднаціскнога склада, пераход *е/ё* ў *я* не адбываецца;

*збраяносец* - складаны назоўнік утвораны пры дапамозе злучальнай галоснай *-е-*, якая падпарадкоўваецца агульнаму правілу якання: у першым пераднаціскным складзе *е/ё* пераходзяць у *я*;

*землеўладальнік* - складаны назоўнік утвораны пры дапамозе злучальнай галоснай *-е-*, якая падпарадкоўваецца агульнаму правілу якання: ва ўсіх іншых складах, акрамя першага пераднаціскнога склада, пераход *е/ё* ў *я* не адбываецца;

*элексір* – у запазычаных словах пераход *е/ё* ў *я* не адбываецца.

| | |
|---|---|
| **В3** | З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:<br>*пясчота, адвакацкі, пачэсны, замазка, рэкардсмен.* |

**Адказ: пяшчота**

*пяшчота* – спалучэнне “*шч*” не на стыку марфем не правяраем, акрамя слоў *пясчаны* і *брусчатка*;

*адвакацкі* – напісана правільна, пры ўтварэнні прыметнікаў з суфіксам *-ск-* варта памятаць пра чаргаванні: *ц/т/ч/к + -ск- = цк;*

*пачэсны* – спалучэнне “*стн*” спрашчаецца да “*сн*”;

*замазка* – асіміляцыя па глухасці, на стыку марфем выбіраем праверачнае слова – замазваць;

*рэкардсмен* – асіміляцыя, чуем рэкар[ц]мен, праверачнае слова рэкордны (перад санорнымі).

| | |
|---|---|
| **В4** | З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:<br>*аблічча, калектыў, лісце, паддакваць, прынесенная* |

**Адказ: прынесеная**

*аблічча* – гук [ч] падаўжаецца ў інтэрвакальнай пазіцыі, фанетычнае падаўжэнне перадаецца на пісьме падвоенным напісаннем;

*калектыў* – запазычанае слова (не выключэнне), пішацца адна літара *л*;

*лісце* – спалучэнне “*сц*” не падаўжаецца;

*паддакваць* – спалучэнні аднолькавых літар на стыку марфем (прыстаўка сканчваецца на -*д* і корань пачынаецца на *д*-) перадаецца падвоенным напісаннем без зменаў;

*прынесеная* – дзееприметнік утвораны пры дапамозе суфікса -*ен*-, дзеепрыметнікі ў беларускай мове заўсёды пішам з адной літарай *н*.

| | |
|---|---|
| **B5** | Запішыце лік **900** словам . |

**Адказ: дзевяцьсот**

мяккі знак у лічэбніках можа пісацца на канцы (*пяць, шэсць, дзевяць*), а таксама у сярэдзіне складанага лічэбніка (*пяцьсот, шэсцьсот, дзевяцьсот*)

| | |
|---|---|
| **B6** | З выдзеленых у прыкладах слоў вызначце прыслоўе, якое пішацца разам. *(**па) чалавечы** шчыра, вывучылі **(на) памяць**, бегчы **(на) выперадкі**, ісці **след (у) след**, схапіць **(на) ляту**.* |

**Адказ: навыперадкі**

*па-чалавечы шыра* – пішацца праз злучок прыслоўе з прыстаўкай *па*- і суфіксам -*ы/-і*;

*на памяць* – трэба запомніць, пішацца асобна;

*бегчы навыперадкі* – пішацца разам прыслоўе, нельга падставіць залежнасць, без прыстаўкі не ўжываецца;

*ісці след у след* – пішам асобна спалучэнне назоўнікаў і прыназоўнікаў;

*схапіць на ляту* – пішуцца асобна словы, падобныя да прыслоўяў, але якія не з’яўляюцца прыслоўямі (*без/да/на/з* + дзеянне ўнутры).

| | |
|---|---|
| **B7** | З дзвюх часціц, пададзеных у дужках, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў прапанаваным сказе. Запішыце гэту часціцу: *Гэтую дуброву нельга пілаваць __ ў якім разе.* |

**Адказ: ні**

часціца “*ні*” ўжываецца для ўзмацнення адмаўлення, выражанага ў сказе пры дапамозе слова “*нельга*”

| | |
|---|---|
| **B8** | Выпішыце граматычную аснову наступнага сказа: *На сэрцы ўсё яшчэ трывожна.* |

**Адказ: трывожна**

у аднасастаўным безасабовым сказе граматычная аснова прадстаўлена выказнікам, выражаным прыслоўем

| | |
|---|---|
| **В9** | Вызначце, якія гукі абазначаюць падкрэсленыя ў словах літары (спалучэнні літар), і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А3Б2В1Г4. |

| | |
|---|---|
| А. Рэ***дз***енькі.<br>Б. Ра***с***чырыкацца.<br>В. Мола***дз***ь<br>Г. ***С***нег. | 1. [**ц’**]<br>2. [**дз’**]<br>3. [**с’**]<br>4. [**ш**]<br>5. [**с**] |

**Адказ: А2Б4В1Г3**

1- гук [**дз’**] як мяккая пара гука [**д**] (перад галосным), у дадзеным выпадку не на стыку марфем, таму гаворка ідзе пра адзін гук;
2- гук [**ш**] – асіміляцыя свісцячых да шыпячых ([**с**] – свісцячы, [**ш**] – шыпячы): свісцячы перад шыпячым вымаўляецца як шыпячы;
3- гук [**ц’**] – на канцы слова адбываецца аглушэнне, пара па глухасці да [**дз’**] – гэта [**ц’**];
4- гук [**с’**] – асміляцыя па мяккасці: гук [**н’**] уплывае на папярэдні.

| | |
|---|---|
| **В10** | Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А3Б2В1Г4. |

| | |
|---|---|
| А. Міжаконны.<br>Б. Спакойна.<br>В. МТЗ<br>Г. Падскок. | 1. Абрэвіацыя.<br>2. Словаскладанне.<br>3. Бяссуфіксны (нульсуфіксальны).<br>4. Прыставачна-суфіксальны.<br>5. Суфіксальны. |

**Адказ: А4Б5В1Г3**

1- *міжаконны* – прыметнік утвораны прыставачна-суфіксальным спосабам ад назоўніка акно (прыстаўка *між-* + корань *-акно-* + суфікс *-н-*) – для вызначэння спосабу ўтварэння неабходна раскрываць лексічнае значэнне слова;
2- *спакойна* – прыслоўе на *-а* (адпрыметнікавае) утворана суфіксальным спосабам ад прыметніка *спакойны*;
3- *МТЗ* – абрэвіяцыя (першыя літары кожнага слова), у асноваскладанні выкарыстоўваецца злучальная галосная (*ільн-о-валакно*);
4- *падскок* – назоўнік утвораны бяссуфіксным спосабам (ад дзеяслова *падскокваць*).

| | |
|---|---|
| **В11** | Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Напрыклад: А2Б5В3Г4. |

| | |
|---|---|
| А. Браць быка за рогі.<br>Б. Браць верх.<br>В. Браць голымі рукамі.<br>Г. Браць за каўнер. | 1. Падпарадкоўваць каго-небудзь сваёй волі.<br>2. Авалодваць без асаблівых цяжкасцей.<br>3. Смела пачынаць з самага галоўнага.<br>4. Прымушаць паступіць пэўным чынам.<br>5. Прыцягваць да адказнасці, караць. |

**Адказ: А3Б1В2Г5**

*Браць (узяць) быка за рогі* — пачынаць дзейнічаць энергічна, адразу і з самага галоўнага.

*Браць (узяць) верх над кім* — дамагацца (дамагчыся) перавагі, адольваць (адолець) каго-небудзь.

*Браць (узяць) голымі рукамі* — авалодваць (авалодаць) кім-небудзь без асаблівых цяжкасцей.

*Браць (узяць) за каўнер, за карак* — прыцягнуць да адказнасці.

**Тэкст да заданняў В12–В22**

**(1)** Бурдзьё кажа (Bourdieu 2001:459), што фарміраванне спецыфічна літаратурных інстытуцый дазваляе літаратурнаму полю распрацаваць сваі ўласныя формы і законы («nomos»). **(2) Ён**, даючы шырокую дэфініцыю паняццю інстытуцыі, падсумоўвае тыя механізмы, **якія** ахоўваюць і рэгламентуюць поле (як літаратурны рынак, выдавецтва, літаратурная крытыка і г.д.). **(3)** У сувязі з гэтым фан Рэс (van Rees 1983:397) прымае літаратурную ***крытыку*** за адну з дамінуючых літаратурных інстытуцый, якія ў вырашальнай меры ўплываюць на прадукцыю, дыстрыбуцыю, а таксама на рэцэпцыю літаратуры. **(4)** Нягледзячы на значнасць функцыянуючых інстытуцый для здольнасці літаратурнага поля (к/да) аўтаномнасці, інстытуцыянальная аўтаномія, зноў жа, (заставацца) адноснай, паколькі літаратурнае поле заўсёды размяшчалася ўнутры поля ўлады і заўжды знаходзілася ў эканамічным, палітычным узаемадзеянні з ім. **(5)** На погляд ***даследчыка***, літаратурнае поле прынцыпова слаба інстытуцыяналізаванае ў параўнанні з іншымі палямі.

**(6)** Узнікненне і прымальнасць акрэсленых пастулатаў наконт інстытуцыянальнай і эстэтычнай аўтаноміі ўнутры літаратурнай сістэмы, **якія** рэдка развіваюцца прапарцыянальна адна адной, у рэшце рэшт даюць **звесткі** пра ступень аўтаномнасці поля. **(7)** Калі зараз паспрабаваць пры дапамозе мадэлі тэорыі поля апісаць аўтаномію ўнутры “малых” літаратур (ці ступень іх агульнай аўтаномнасці) на прыкладах, тады трэба ***звярнуць*** увагу на тое, што непасрэднае ўжыванне тэорыі поля ў адносінах да малых літаратур не можа адпавядаць іх асаблівым спецыфікам. **(8)** З гэтай прычыны **прапанаваны падыход** з’яўляецца толькі эўрыстычным выкарыстаннем мадэлі.

| | |
|---|---|
| **В12** | Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:<br>1) тэкст афіцыйнага стылю |

| | |
|---|---|
| | 2) тэкст публіцыстычнага стылю<br>3) тэкст мастацкага стылю<br>4) тэкст навуковага стылю<br>5) тэкст гутарковага стылю |

**Адказ: 4**

Тэкст навуковага стылю прадстаўляе сабой *лагічны, дакладны, безэмацыйны тэкст*, які распавядае пра пэўныя факты фундаментальнай ці прыкладной навукі, рэчаіснасці і г.д. У тэксце прысутнічаюць тэрміны, падаюцца спасылкі на навуковыя працы, узгадваюцца рэальныя асобы. Прыметай навуковага тэксту з'яўляецца адсутнасць эмацыйна-экспрэсіўнай лексікі, сродкаў мастацкай выразнасці, элептычных сказаў і інш.

| | |
|---|---|
| **B13** | З двух слоў, выдзеленых у **2-м** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі **1-га** і **2-га** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў **2-м** сказе. |

**Адказ: ён**

сродкам сувязі першага і другога сказа з'яўляецца займеннік **ён** (Бурдзьё – ён), у той час як злучальнае слова "*якія*" з'яўляецца сродкам сувязі ўнутры сказа, злучаючы галоўную і даданую часткі складаназалежнага сказа

| | |
|---|---|
| **B14** | Знайдзіце ў **3-м** сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў **3-м** сказе. |

**Адказ: асаблівым**

Спецыфіка – адметная асаблівасць прадмета ці з'явы. Ужыванне прыметніка *асаблівае* парушае правільнасць маўлення, паўтараючы ўжо вядомую інфармацыю з лексічнага значэння слова *спецыфіка*.

| | |
|---|---|
| **B15** | Запішыце выдзелены ў **3-м** сказе тэксту назоўнік у форме давальнага склону адзіночнага ліку. |

**Адказ: крытыцы**

назоўнік 1 скланення (ж.р. з канчаткам -*а* ў Н. скл.) з асновай на -*к*: у Д. скл. адбываецца чаргаванне асновы *к//ц*, канчатак -*ы* выбіраем таму, што націск падае на аснову

| | |
|---|---|
| **B16** | Ад назоўніка, выдзеленага ў **5-м** сказе тэксту, утварыце пры дапамозе суфікса **-ск-** прыметнік. Запішыце гэты прыметнік у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду. |

**Адказ: даследчыцкі**

пры ўтварэнні прыметнікаў з суфіксам -*ск*- варта памятаць пра чаргаванні:

*ц/т/ч/к + -ск- = цк*

даследчы**к + -ск- = кск - цк**

| | |
|---|---|
| **B17** | Знайдзіце ў **1-м** сказе тэксту слова, якое мае няправільную граматычную форму. Запішыце гэта слова ў патрэбнай граматычнай форме. |
| **Адказ: свае** | |
| прыналежны займеннік "*свой*" у форме множнага ліку (у Н. і В. скл.) мае канчатак -*е* | |
| **B18** | Запішыце прапанаваны ў дужках у **4-м** сказе дзеяслоў у форме абвеснага ладу прошлага часу адзіночнага ліку жаночага роду. |
| **Адказ: заставалася** | |
| пры ўтварэнні патрэбнай формы дзеяслова звяртаем увагу на трыванне (закончанае / не-), а таксама не забываем, што пры ўтварэнні формы ад зваротнага інфінітыва, форма таксама будзе захоўваць зваротнасць (постфікс);<br>абвесны лад – дзеянне, што адбывалася, адбываецца ці будзе адбывацца | |
| **B19** | Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў **7-м** сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе і запішыце яго. |
| **Адказ: звярнуўшы** | |
| пры ўтварэнні дзеепрыслоўяў абапіраемся на трыванне дзеяслова, ад якога неабходна ўтварыць форму дзеепрыслоўя, дзеепрыслоўе ў дадзеным выпадку ўтвараецца пры дапамозе суфікса -*ўшы*- (аснова інфінітыва (частка без суфікса інфінітыва) заканчваецца на галосны) – характэрна для ўтварэнне ад дзеясловаў закончанага трывання | |
| **B20** | З двух прыназоўнікаў, прапанаваных у дужках у **4-м** сказе тэксту, вызначце той, які павінен быць ужыты ў дадзеным сказе. Запішыце гэты прыназоўнік. |
| **Адказ: да** | |
| трэба памятаць, што прыназоўніка "*к*" не існуе | |
| **B21** | З двух слоў, выдзеленых у **8-м** сказе тэксту, вызначце тое, якое мае нулявы суфікс. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў **8-м** сказе. |
| **Адказ: падыход** | |
| *прапанаваны* – дзеепрыметнік, які ўтвораны пры дапамозе суфікса -*н*-;<br>*падыход* – назоўнік утвораны нульсуфіксальным (бяссуфіксным) спосабам | |
| **B22** | З двух слоў, выдзеленых у **6-м** сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца дзейнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў **6-м** сказе тэксту. |
| **Адказ: якія** | |

злучальнае слова “*якія*” – займеннік (сістэмы) – з’яўляецца сродкам сувязі частак у складаназалежным сказе і выконвае сінтаксічную ролю дзейніка (дзейнікам можа быць займеннік у Н. скл.);

(даюць) *звесткі* – назоўнік выконвае сінтаксічную ролю дапаўнення (звязаны сувяззю кіравання з дзеясловам, адказвае на пытанне ўскоснага склону (В. скл.) і абазначае аб’ект